*Т.С.ЖЫЛІНСКАЯ*

# МЕДЫЯКУЛЬТУРА – АБАВЯЗКОВЫ КАМПАНЕНТ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ СПЕЦЫЯЛІСТА КУЛЬТУРАЛАГІЧНАГА ПРОФІЛЮ

*Артыкул прысвечаны навукова-метадычным праблемам выкладання цыкла інфармацыйных дысцыплін у працэсе падрыхтоўкі спецыяліста культуралагічнага профілю. Аналізуюцца змястоўныя характарыстыкі інфармацыйнай і медыякультуры асобы, іх суадносіны. Выкладаецца погляд на медыяасяроддзе як на інтэрактыўны, камунікатыўны і сінергічны сродак доступу да інфармацыйных рэсурсаў грамадства і як на сферу прафесійнай дзейнасці і мастацкай творчасці. Адсюль вынікае неабходнасць засваення медыякультурных ведаў, уменняў і навыкаў як кампанентаў інфармацыйнай культуры будучага спецыяліста культуралагічнага профілю.*

Інфарматызацыя – аб'ектыўны працэс, які закранае ўсе сферы жыцця грамадства [5]. Адэкватныя гэтаму працэсу змены ў адукацыі – ключавая ўмова, што вызначае паспяховае развіццё навукі і культуры, а ўрэшце – і ўсяго грамадства. Па гэтай прычыне змяняецца асноўная адукацыйная мэта, якая прадугледжвае не толькі засваенне пэўнай колькасці ведаў, але і забеспячэнне ўмоў для самавызначэння і самарэалізацыі асобы. Інфармацыя становіцца стратэгічным рэсурсам*, і таму кожны чалавек для паспяховай дзейнасці ва ўмовах інфармацыйнага грамадства павінен валодаць дастатковым узроўнем інфармацыйнай культуры [4].

Пад інфармацыйнай культурай (далей – ІК) большасць даследчыкаў разумеюць усю грамадска значную чалавечую дзейнасць, звязаную з любымі інфармацыйнымі працэсамі і з працэсам інфарматызацыі грамадства. І таму натуральна, што педагагічная мэта – фарміраванне інфармацыйнай культуры спецыяліста – ставіцца і дасягаецца пры выкладанні такіх дысцыплін, як "ІК асобы", "ІК спецыяліста", што вывучаюцца студэнтамі ў адпаведнасці з агульнай праграмай інфарматызацыі грамадства і адукацыі. Наогул, трэба адзначыць, што сёння выкладанне курсаў, мэта якіх – фарміраванне ІК спецыяліста, магчыма толькі ў межах цыкла інфармацыйных дысцыплін.

Існуючыя курсы па фарміраванні ІК спецыяліста ў галіне культуры і мастацтва (далей – ІКСК) прапануюць раздзелы для вывучэння, дзе разглядаюцца інфармацыя і яе функцыянаванне ў грамадстве; інфармацыйныя рэсурсы грамадства; тэхналагічныя аспекты інфармацыйна-пошукавай дзейнасці асобы: пошук інфармацыі, афармленне вынікаў бібліяграфічнага пошуку і інш.

Але працэс інфарматызацыі грамадства зараз не здаецца даследчыкам такім прамалінейным, як некалькі гадоў таму. Сёння ў ім вылучаюць да пяці асобных падпрацэсаў (прынцыпаў), якія ўмоўна могуць быць названы электранізацыя, камп'ютэрызацыя, інфарматызацыя, медыятызацыя і віртуалізацыя [15]. Тут інфарматызацыя разумеецца ў вузкім сэнсе, як першасны працэс укаранення інфармацыйных камп'ютэрных тэхналогій, а тэрмін "медыятызацыя" азначае працэс станаўлення медыяасяроддзя як спецыфічнага інтэрфейса паміж грамадствам і яго інфармацыйнымі рэсурсамі. Натуральна, што без валодання інтэрфейсам інфармацыйныя зносіны немагчымы.

Таму, дэтальна прааналізаваўшы змест курсаў, якія маюць на мэце фарміраванне ІКСК, мы адзначаем, што яны недастатковыя і павінны быць дапоўнены новым складнікам, адпаведным сучасным уяўленням аб працэсе інфарматызацыі, і новай адпаведнай мэтай. Гэты новы складнік – веды і ўменні, неабходныя для паспяховай прафесійнай і творчай дзейнасці ў медыяасяроддзі. А новая мэта – *фарміраванне медыякультуры спецыяліста* як неабходнага кампанента яго інфармацыйнай культуры.

---

*Набыццё інфармацыйнымі рэсурсамі статусу стратэгічных вызначаецца тым, што ў любой сферы дзейнасці, перавагу маюць тыя, хто валодае паўнатой доступу да інфармацыі і адпаведнымі сродкамі яе атрымання, апрацоўкі, распаўсюджвання і захоўвання [19, с. 10].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, мэта артыкула ў тым, каб, па-першае, прааналізаваць змест паняцця ІКСК, па-другое, вызначыць медыякультурныя веды і ўменні, абгрунтаваць іх неабходнасць для спецыялістаў культуралагічнага профілю, па-трэцяе, адпаведна ўдакладніць змест паняцця ІКСК ў той частцы, якая мае дачыненне да гэтых ведаў і ўменняў.

Вызначэннем зместу паняцця ІК у розныя гады займаліся вучоныя розных кірункаў ведаў. Гэты тэрмін узнік у канцы 70-х гг. мінулага стагоддзя. Ён ужыты, у прыватнасці, у працах Г.Г.Вераб'ёва [3]. Паводле Н.І.Гендзінай, сэнс, які надаваўся ў той час гэтаму тэрміну, дастаткова далёкі ад сучаснага, але пасля выхаду ў свет прац К.М.Вайханскай і Б.А.Смірнова словазлучэнне "інфармацыйная культура" стала шырока ўжывацца, а потым увайшло ў навуковы абарот [4, с. 15].

А.П.Яршоў [7], В.А.Каймін [10], Н.М.Розенберг [16], В.Ю.Мілітараў, Я.П.Смірноў і І.М.Яглоў [13], А.І.Бочкін [1] вызначылі кампанентны склад ІК навучэнца. Н.Б.Зіноўева [9], Н.І.Гендзіна [4], Т.В.Кузьмініч [12] вывучалі змест паняцця ІК асобы. А.В.Данільчук [6], Г.М.Сендзер, Т.В.Нічышына [17] разглядалі ІК педагога. А.І.Паўлоўскі [14] асобна вылучае кампанентны склад ІК настаўніка інфарматыкі.

Вывучэннем зместу ІКСК займаецца Н.Б.Зіноўева ў Расійскай Федэрацыі, Т.В.Кузьмініч у Рэспубліцы Беларусь. Вучэбны дапаможнік Т.В.Кузьмініч [12] перш за ўсё адрасаваны спецыялістам культуралагічнага профілю.

Сустракаюцца розныя азначэнні паняцця "ІК асобы", на наш погляд, найбольш удалыя наступныя: *"…сацыяльна-прагрэсіўная дзейнасць чалавека па фарміраванні ведаў, уменняў і навыкаў ствараць і выкарыстоўваць інфармацыю ў мэтах гарманізацыі асобы, пераадолення недахопаў дысфункцыянальнага спажывання інфармацыі, распазнання інфармацыйных маніпуляцый і ўменне супрацьстаяць ім"* [9, с. 122]; *"…адзін са складнікаў агульнай культуры чалавека, сукупнасць інфармацыйнага светапогляду і сістэмы ведаў і ўменняў, якія забяспечваюць мэтанакіраваную самастойную дзейнасць па аптымальным задавальненні індывідуальных інфармацыйных патрэбнасцей з выкарыстаннем як традыцыйных, так і новых інфармацыйных тэхналогій. З'яўляецца важным фактарам паспяховай прафесійнай і непрафесійнай дзейнасці, а таксама сацыяльнай абароненасці асобы ў інфармацыйным грамадстве"* [4, с. 32].

На наш погляд, першае азначэнне акцэнтуе ўвагу на сацыяльным аспекце дзейнасці і таму больш ужываецца ў адносінах да сацыяльных груп, чым да асобы. Другое тычыцца асобы, але з'яўляецца не вельмі выразным.

Наша думка такая, што ІКСК ёсць, з аднаго боку, "адзін са складнікаў агульнай культуры" дадзенай сацыяльнай групы (спецыялістаў у галіне культуры і мастацтва), які вызначаецца дачыненнем гэтай сацыяльнай групы да інфармацыйнага грамадства ўвогуле і да інфармацыйных працэсаў у прыватнасці, а з другога – "сацыяльна-прагрэсіўная дзейнасць" (тых жа спецыялістаў) у інфармацыйнай прасторы, што ўключае выкарыстанне інфармацыйных і камунікацыйных рэсурсаў, эфектыўны доступ да якіх магчымы сёння толькі праз медыяасяроддзе.

Тэхналагічным ядром медыяасяроддзя з'яўляюцца тэхналогіі электронных камунікацый (асабліва сетка Інтэрнэт) і мультымедыйныя тэхналогіі – сродак сінергіі розных формаў уздзеяння: выява, гук, тэкст і інш. Менавіта гэтыя тэхналогіі найбольш выкарыстальныя ў якасці інтэрфейсавых і пры дзейнасці, звязанай з інфармацыйнымі рэсурсамі.

Варта адзначыць пэўную блізкасць двух асноўных складнікаў гэтай сферы – сеткі Інтэрнэт (далей – Сетка) і мультымедыя, што і дазволіла паўстаць сімбіёзу дзвюх спачатку розных з'яў. Сапраўды, Сетка паўстала як феномен інфармацыйнай культуры постіндустрыяльнага грамадства "трэцяй хвалі"* і спачатку мела значэнне толькі як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

* Сучаснае інфармацыйнае грамадства часта называюць грамадствам "трэцяй хвалі". У адрозненне ад "першай" і "другой" хваляў, якія характарызуюцца дамінаваннем тэхналогій агрыкультуры і індустрыяльных тэхналогій адпаведна, "трэцяя хваля" вызначаецца як грамадства з дамінаваннем інфармацыйных тэхналогій. Яго характэрная прымета – атаясамліванне ўзроўню культуры з колькасцю і якасцю інфармацыі [19].

тэхналогія камунікацыі камп'ютэрных рэсурсаў. Ні аб якім выкарыстанні яе дзеля мэт мультымедыйнай дзейнасці размова не ішла.

Гэтак і мультымедыя першапачаткова паўстала не ў Сетцы, і некаторы час Сетка ёй як сродак камунікацыі не патрабавалася. Першыя мультымедыя ўяўлялі сабой простую трансляцыю (шляхам дыгіталізацыі) камбінацый фрагментаў ужо існуючых прадуктаў культуры. Асяроддзем іх "увасаблення" быў асобны, ізаляваны ад іншых, камп'ютэр. Ужо на гэтым, пачатковым этапе можна адзначыць наяўнасць у мультымедыйных аб'ектаў прымітыўнай інтэрактыўнасці, рэалізаванай у лепшым выпадку ў выглядзе меню, а часцей проста ў выглядзе лічбавых запытаў. Інтэрактыўнасць першых мультымедыйных прадуктаў мела утылітарны характар "выдачы інфармацыі па запыце". Але вельмі хутка выявілася патрэбнасць у "сяброўскім інтэрфейсе" паміж карыстальнікам і мультымедыя, што прывяло да ўдасканалення інтэрактыўнасці і ўзнікнення прынцыпова новых спосабаў яе рэалізацыі. Узніклі першыя гіпертэксты, гіпермедыя, кантэкстныя меню і інш. Стандартныя прылады ўводу – вываду інфармацыі пачалі саступаць і зараз усё больш саступаюць месца ўласна мультымедыйным інтэрактыўным прыладам, пры дапамозе якіх рэалізуюцца магчымасці тактыльнай, аўдыё, візуальнай і іншай інтэрактыўнасці.

Мы пагаджаемся з тымі даследчыкамі, якія вылучаюць уласцівасць інтэрактыўнасці мультымедыя як вызначальную [11]. Па-першае, таму, што з пункту гледжання прафесійнай дзейнасці і творчасці менавіта інтэрактыўнасць адрознівае мультымедыя ад такой традыцыйнай культурнай з'явы, як сінтэз мастацтваў. Па-другое, таму, што з пункту гледжання інфарматыкі, дзякуючы інтэрактыўнасці, можна гаварыць аб новым узроўні апрацоўкі інфармацыі [2]. Па-трэцяе, таму, што з пункту гледжання культуралогіі інтэрактыўнасць сучасных мультымедыйных прадуктаў як спосаб зваротнай сувязі паміж суб'ектам і аб'ектам прымушае чалавека бачыць у іх адлюстраванне элементаў сваёй уласнай інтэлектуальнай дзейнасці [19]. І, нарэшце, таму, што мы не ведаем прыклады інтэрактыўных сістэм такога ўзроўню, як сучасныя мультымедыйныя прадукты.

Яшчэ адна амаль атрыбутыўная ўласцівасць сучасных мультымедыя – камунікатыўнасць. Сучасныя мультымедыйныя прадукты валодаюць, як правіла, велізарнымі магчымасцямі камунікацыі. (Характэрнай з'явай, якая пацвярджае гэта, з'яўляецца Wikipedia – www.wikipedia.org – "вольная энцыклапедыя", што ствараецца ў Інтэрнеце ўсімі жадаючымі.)

Зыходзячы з гэтага, становіцца зразумелым, што сучасны Інтэрнет, які валодае як неабмежаванымі камунікацыйнымі магчымасцямі, так і неабмежаванымі магчымасцямі рэалізацыі інтэрактыўнасці, з'яўляецца аптымальным "асяроддзем" для мультымедыя. З іншага боку, сам Інтэрнет ужо цяпер можна разглядаць як адзіны глабальны мультымедыйны аб'ект. У нас няма ніякіх сумненняў у тым, што тэндэнцыя ператварэння Сеткі з утылітарнага камунікацыйнага сродку ў гіпермедыйную тэхналогію будзе толькі ўзмацняцца. Таму не перспектыўна падзяляць мультымедыя і Сетку. У нашым разуменні мультымедыя ёсць інтэграваная з'ява сучаснай культуры, якая ўключае і камунікацыйнае, і інтэрактыўнае асяроддзе.

Пры гэтым ні з культуралагічнага, ні з педагагічнага пунктаў гледжання нам не падаюцца істотнымі такія, на наш погляд, тэхнічныя асаблівасці, як спосабы рэалізацыі тэхналогій камунікацыі і інтэрактыўнасці. Такім чынам, асноўнымі, родавымі прыметамі мультымедыя і як сацыякультурнага феномена, і як сферы мастацкай творчасці і прафесійнай дзейнасці з'яўляюцца не электронныя тэхналогіі, а *камунікатыўнасць* (патэнцыяльна не абмежаваная, глабальная), *інтэрактыўнасць* (што рэалізуецца звычайна ў выглядзе гіпертэксту ці гіпермедыя), *сінергія* формаў уздзеяння і ўспрымання.

Гэтыя прыметы мультымедыя адказныя за ўзнікненне з'явы, што атрымала назву "віртуальная рэальнасць" [11]. Больш адэкватным, на наш погляд, быў бы тэрмін "інфармацыйная рэальнасць", таму што асноўным прадуктам інфармацыйных тэхналогій і ў рэшце рэшт самога інфармацыйнага грамадства з'яўляецца новае, інфармацыйнае асяроддзе, якое магчыма назваць "інфармацыйная рэальнасць", бо менавіта ў яе ўсё больш і больш перамяшчаецца дзейнасць сучаснага чалавека (і нават яго існаванне як сацыяльнай істоты) са звычайнай рэальнасці. Гэта інфармацыйная рэальнасць ёсць другасная ў стаўленні да звычайнай рэальнасці і з'яўляецца прадуктам мэтанакіраванай чалавечай дзейнасці, творам чалавечай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У адпаведнасці з гэтым В.У.Шлыкава вылучае новы від культуры (электроннай), якую яна разглядае як сацыяльна актыўную, накіраваную чалавечую дзейнасць у азначанай сферы. Пры гэтым дадзеная сфера дзейнасці вызначаецца як новы сацыякультурны (у прыватнасці сацыяльна-камунікацыйны) феномен, з аднаго боку, як тэхналогія сацыякультурнай камунікацыі, з другога, як форма мастацкай творчасці і прылада прафесійнай дзейнасці, з трэцяга [19].

Але вылучэнне гэтай сферы дзейнасці і адпаведнай ёй часткі культуры з агульнага кантэксту медыяасяроддзя і медыякультуры (безумоўна, прадуктыўнае для мэт філасофскага і культуралагічнага даследавання) не задавальняе нас з педагагічнага пункту гледжання, бо, як мы ўжо адзначалі, такое вылучэнне ідзе па лініі нязначных на педагагічны погляд асаблівасцей рэалізацыі пэўных тэхналогій. Тым больш, што "традыцыйнае" медыяасяроддзе – тое, што можна назваць "медыя" Маклюэна, – ужо амаль цалкам мае сваё адлюстраванне ў медыяасяроддзі "электронным". Такім чынам, педагог зноў мусіць прыйсці да высновы, што медыяасяроддзе вызначаецца ў першую чаргу як *камунікатыўны*, *інтэрактыўны*, *сінергічны* сродак доступу (інтэрфейс) да інфармацыйных рэсурсаў і як сфера будучай мастацкай творчасці і прафесійнай дзейнасці яго навучэнцаў.

У тэрміналагічным слоўніку А.В.Фёдараў вызначае, што медыякультура "выступае сістэмай узроўняў развіцця асобы, здольнай успрымаць, аналізаваць, ацэньваць медыятэкст, займацца медыятворчасцю, засвойваць новыя веды ў галіне медыя" [18]. У дадзеным кантэксце тэрмін "медыякультура" ўжываецца ў расійскай культуралогіі і педагогіцы [8].

"Медыя" амаль абавязкова з'яўляецца часткай устойлівых пазначэнняў для розных выразных і выяўленчых сродкаў, што грунтуюцца на сучасных тэхналогіях, якія маюць непасрэднае дачыненне да віртуальнай рэальнасці (мультымедыя, гіпермедыя, медыякамп'ютэр, медыясервер, медыяінфармацыя, медыяплэер і нават медыяасяроддзе). Гэтае слова стала культуралагічным знакам і ўваходзіць у склад цэлага шэрага тэрмінаў, якія пазначаюць сацыякультурныя феномены інфармацыйнага грамадства (медыярэсурс, медыятызацыя, мас-медыя, мультымедыя і інш. ), у тым ліку і тых, што маюць дачыненне непасрэдна да галіны адукацыі (медыяпісьменнасць, медыякампетэнтнасць, медыяадукацыя).

У сувязі з вышэйсказаным нам уяўляецца зручным і натуральным выкарыстаць тэрмін "медыякультура" для абазначэння сацыяльна-прагрэсіўнай чалавечай дзейнасці ў сферы мультымедыя. У дадзеным кантэксце "медыя" абазначае яшчэ і асяроддзе актыўнай, мэтанакіраванай і, безумоўна, прагрэсіўнай чалавечай дзейнасці. Гэтае азначэнне стасуецца з азначэннем А.У.Фёдарава і абагульняе яго з пункту гледжання агульнага ўяўлення аб культуры як "другой прыродзе ў цэлым і мэтанакіраванай чалавечай дзейнасці ў прыватнасці".

На наш погляд, гэтак жа магчыма азначэнне медыякультуры як сацыяльна-прагрэсіўнай чалавечай дзейнасці ў медыяасяроддзі, якое трэба разумець як сродак доступу да інфармацыйных і камунікацыйных рэсурсаў.

Пасля высвятлення месца медыякультуры і яе суадносін з інфармацыйнай культурай і культурай віртуальнай рэальнасці мы гатовы да абмеркавання складу тэрмінаў "медыякультура асобы" і "медыякультура спецыяліста". Па нашым меркаванні, натуральна гаварыць, што медыякультура асобы ёсць вынік дзейнасці асобы па засваенні ведаў, уменняў і навыкаў ствараць і выкарыстоўваць мультымедыя (ці больш агульна – аб'екты медыяасяроддзя) у мэтах сваёй творчай і прафесійнай дзейнасці. Медыякультура асобы – таксама ўзровень і характарыстыка здольнасцей і магчымасцей дзейнасці асобы ў медыяасяроддзі. Неабходны ўзровень медыякультуры асобы дазваляе ёй эфектыўна пераадольваць недахопы ўспрымання інфармацыі шляхам медыяасяроддзя, распазнаваць маніпуляцыі з яго боку і процістаяць гэтым маніпуляцыям.

Адпаведна пад медыякультурай спецыяліста мы разумеем (у дапаўненне да высокага ўзроўню медыякультуры яго асобы) сфарміраванасць агульных і спецыяльных медыякультурных уменняў, якія грунтуюцца на глыбокіх ведах і трывалых навыках, што атрыманы пры вывучэнні шэрага дысцыплін, звязаных са стварэннем і выкарыстаннем

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

мультымедыя: інфарматыка і інфармацыйная культура, праектаванне інфармацыйных сетак і інтэрактыўных сістэм, камп’ютэрная графіка і анімацыя, web-дызайн.

Бывае, што патрабаванні часу апераджаюць фундаментальныя даследаванні. Гэта добра бачна на прыкладзе педагогікі і методыкі выкладання дысцыплін, якія звязаны таксама і з інфарматызацыяй чалавечай дзейнасці. Сучасны спецыяліст не можа не валодаць інфармацыйнымі тэхналогіямі. Каб падрыхтаваць такога спецыяліста, педагогу і метадысту ўжо зараз трэба арыентавацца ў такіх рэчах, аб якіх 20 гадоў таму яшчэ ніхто і не чуў. Склад праграм і курсаў, што выкладаюцца навучэнцам пры падрыхтоўцы, непасрэдна залежыць ад складу тых з’яў і працэсаў, з якімі ім ужо ў якасці дыпламаваных спецыялістаў давядзецца сутыкнуцца ў прафесійнай дзейнасці. Адзін з сацыякультурных феноменаў – інфармацыйнае грамадства і яго станаўленне і развіццё. Адпаведна развіваюцца інфармацыйная культура, медыяасяроддзе і медыякультура. Гэты працэс вельмі дынамічны і часам непрадказальны. Таму немагчыма спадзявацца на канчатковае ўсталяванне складу адпаведнага тэрміна. Безумоўна, больш-менш стабільным застанецца тое азначэнне, што вынікае з агульнанавуковага азначэння культуры (як другой прыроды чалавека ў цэлым і яго сацыяльна-прагрэсіўнай дзейнасці ў прыватнасці). Але такое азначэнне не ўтрымлівае сучаснага складу з’яў ІК і медыякультуры з патрэбнай для нас падрабязнасцю. Таму ў гэтым артыкуле мы зрабілі спробу абгрунтаваць неабходнаць вылучэння ў складзе ІКСК адмысловай медыякультурнай кампаненты. Гэта дае магчымасць не толькі навукова пераасэнсаваць некаторыя акцэнты ў выкладанні інфармацыйных дысцыплін будучым спецыялістам культуралагічнага профілю, але і спрагназіраваць далейшае развіццё тых з’яў і працэсаў, што будуць або перашкаджаць, або дапамагаць нашым навучэнцам у іх дзейнасці, і не толькі прафесійнай.

У артыкуле мы паказалі неабходнасць для спецыялістаў культуралагічнага профілю валодання медыякультурнымі ведамі і ўменнямі. Але здаецца, што зараз і гэтага ўжо недастаткова. На нашу думку, пераарыентацыя ў бок медыякультуры наспявае (калі ўжо не наспела), настаў час не проста змены акцэнтаў, але пэўнай пераарыентацыі ў выкладанні ІК спецыялістам культуралагічнага профілю.


1. *Бочкин, А.И.* Методика преподавания информатики: учеб. пособие для педагогических специальностей вузов / А.И.Бочкин. – Мн.: Вышэйш. шк., 1997. – 430 с.

2. *Вернер, Ингенблек.* Все о мультимедиа: учеб. пособие / Ингенблек Вернер. – СПб.: ЭлектроникаБизнесИнформатика, 1996. – 351 с.

3. *Воробьёв, Г.Г.* Твоя информационная культура / Г.Г.Воробьёв. – М.: Молодая гвардия, 1988. – 303 с.

4. *Гендина, Н.И.* Формирование информационной культуры личности в библиотеках и образовательных учреждениях: учеб.-метод. пособие / Н.И.Гендина [и др.]; под общ. ред. Н.И.Гендиной. – М.: Школьная б-ка, 2003. – 296 с.

5. *Государственная* программа информатизации Республики Беларусь на 2003–2005 годы и на перспективу до 2010 года “Электронная Беларусь”: постановление Совета министров Республики Беларусь, 27 дек. 2002 г., № 1819 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2003. – № 3. – 5/11734.

6. *Данильчук, Е.В.* Методологические предпосылки и сущностные характеристики информационной культуры педагога / Е.В.Данильчук // Педагогика. – 2003. – № 1. – С. 65–73.

7. *Ершов, А.П.* Школьная информатика в СССР: от грамотности к культуре / А.П.Ершов // Информатика и компьютерная грамотность. – М.: Наука, 1988. – С. 6–23.

8. *Залагаев, Д. В.* Развитие медиаграмотности учащихся в процессе обучения информатике: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.02 / Д.В.Залагаев; Омск. гос. пед. ун-т. – Омск, 2005. – 24 с.

9. *Зиновьева, Н.Б.* Информационная культура личности: введение в курс: учеб. пособие / Н.Б.Зиновьева; Краснодар. гос. академия культуры. – Краснодар, 1996. – 133 с.

10. *Каймин, В.О.* О преподавании курса ОИВТ по машинному варианту / В.О.Каймин, Н.Д.Угринович // Информатика и образование. – 1989. – № 2. – С.17–22.

11. *Кастельс, М.* Информационная эпоха. Экономика, общество и культура / М.Кастельс. – М.: ГУВШЭ, 2000. – 607 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. *Кузьмініч, Т.В.* Інфармацыйная культура асобы: вучэбны дапаможнік / Т.В.Кузьмініч. – Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры, 2002. – 168 с.

13. *Милитарев, В.Ю.* Информатика и информационная культура / В.Ю.Милитарев, Е.П.Смирнов, И.М.Яглов // Советская педагогика. – 1988. – № 6. – С. 61–64.

14. *Паўлоўскі, А.І.* Інфармацыйная культура настаўніка інфарматыкі / А.І.Паўлоўскі // Народная асвета. – 1992. – № 8. – С. 64–68.

15. *Попов, А.А.* Институциональные параметры информационного общества: технологический, научный, социальный, антропологический: дис. ... канд. филос. наук: 09.00.11 / А.А.Попов; Чувашск. гос. ун-т им. И.Н.Ульянова. – Самара, 2007. – 195 с.

16. *Розенберг, Н.М.* Информационная культура в содержании общего образования / Н.М.Розенберг // Советская педагогика. – 1991. – № 3. – С. 33–38.

17. *Сендер, А.Н.* Диагностика уровня сформированности информационной культуры студентов / А.Н.Сендер, Т.В.Ничишина // Вучоныя запіскі Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С.Пушкіна: зб. навук. прац: у 2 т. – Т. 1, ч. 1. – Брэст: Брэсцкі дзярж. ун-т, 2005. – С. 133–144.

18. *Федоров, А.В.* Краткий словарь основных медиаобразовательных терминов / А.В.Федоров // Медиатека. – 2006. – № 2. – С. 33–37.

***19. Шлыкова, О.В.*** **Социокультурная природа мультимедиа: автореф. дис. … докт. культурологии: 24.00.01 / О.В.Шлыкова; Моск. гос. ун-т культуры и искусств. – М., 2004. – 42 с.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ